**Праект.** Нацыянальная бібліятэка дала аддалены доступ да лічбавых копій дакументаў з яе фондаў у рамках праекта па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы «Электронная бібліятэка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі». Ён рэалізуецца ў некалькі этапаў. На першым у анлайн-прасторы сталі даступны кніжныя выданні, аўтарэфераты дысертацый і дысертацыі, ноты, плакаты, эстампы, паштоўкі і іншыя выяўленчыя матэрыялы. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» матэрыялы прадстаўлены ў адкрытым і абмежаваным доступе. Дакументы ў адкрытым доступе можна праглядаць у любым зручным месцы і спампоўваць у фармаце *pdf*. Дакументы з абмежаваным доступам можна праглядаць у чытальных залах бібліятэкі або атрымліваць іх фрагменты з дапамогай службы электроннай дастаўкі дакументаў. Колькасць матэрыялаў, прадстаўленых у аўтаматызаванай сістэме «Электронная бібліятэка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», пастаянна павялічваецца.